Падтрымай "Вясну" на PATREON

Судовую эстафету пераняла Гародня: сёння - 13 адміністрацыйных судоў

дапоўнена

14.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў




"Марш недармаедаў"19 лютага. Фота: Hrodna.life

Пераляканыя гарадзенскія ўлады вырашылі збіць пратэстны настрой гарадзенцаў масавымі судовымі працэсамі. Па інфармацыі мясцовых праваабаронцаў, на 14 сакавіка прызначаны разгляд адразу 13-ці адміністрацыйных спраў.

Пачынаючы з 10 гадзін раніцы ў судзе Ленінскага раёна Гародні будуць слухацца наступныя справы:

сябраў БХД **Вольгі і Сяргея Верамеенкаў**, **Антона Вайцехава, Галіны Ламашэвіч, Аляксандра Абуховіча**, сябраў АГП **Ежы Грыгенчы і Мікалая Саляніка**, сябра БНФ **Вадзіма Саранчукова**, сябра БСДП **Анатоля Мышкевіча** - усе з Гародні, сябра АГП **Віталя Гуляка** з Ваўкавыску і сябра АГП **Ірыны Давідовіч** з Іўя.



СПИСОК

уголовных, административных дел, назначенных к слушанию в суде на 14 марта 2017 года

п/п	Время начала слушания	Фамилия, инициалы обвиняемых, лиц, привлекаемых к административной ответственности.	Статьи Уголовного кодекса, Кодекса об административных правонарушениях.
		Казакевич Ю.В. каб. №44	
	10.30	Тарасевич С.С.	Представление Тюрьмы №1 г.Гродно о прекращении принудительного лечения от алкоголизма
	11.10	Кайлевич И.К.	Представление Тюрьмы №1 г.Гродно о прекращении принудительного лечения от алкоголизма
	12.00	Лазута А.Д.	Представление УЗ «ГОКЦ «Психиатрия-наркология» о прекращении принудительных мер безопасности и лечения
		Петрова Е.А., зал судебных заседаний №1	
	10.00	Браун Е.Т. Григорича Е.И. Мышкевич А.Е.	ч.1 ст.23.34 КоАП Республики Беларусь ч.1 ст.23.34 КоАП Республики Беларусь ч.3 ст.23.34 КоАП Республики Беларусь
		Козел Н.Г., зал судебных заседаний №14	
	10.00	Войтехов А.Г. Обухович А.Г. Веремеенко С.Н.	ч.1 ст.23.34 КоАП Республики Беларусь ч.1 ст.23.34 КоАП Республики Беларусь ч.3 ст.23.34 КоАП Республики Беларусь
		Гурин [illegible], зал судебных заседаний №2	
	10.00	Саляник Н.В. Веремеенко О.М. Ломашевич Г.И. Саранчуков В.В.	ч.1 ст. 23.34, КоАП Республики Беларусь ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь
		Бубенчик Д.В., зал судебных заседаний №3	
	10.00	Гусевич В.Е. Гуляк В.Л. Давидович И.Б.	Ч.1 ст. 23.34, ст. 17.1 КоАП Республики Беларусь Ч.3 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь Ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь
		Сергейко Н.А. каб. №29	
	10.30 14.30	Грицкевич А.В., Грицкевич Е.В., Климато Д.С.	п.6 ч.2 ст.182, ч.2 ст.209 УК Республики Беларусь

Усе яны атрымалі позвы у суд за акцыю "Марш недармаедаў", якая прайшла 19 лютага. Усяго супрацоўнікамі міліцыі складзена 11 пратакалоў аб адміністрацыйным правапарушэнні па артыкуле 23.34 па розных яго частках.

"Не выключана, што ў судзе ўсплывуць і іншыя пратаколы", - паведамляюць гарадзенскія праваабаронцы.

Нібыта у Гародні яшчэ два падсудныя - **В. Гузевіч і Яўген Браун**. Такім чынам 13 чалавек.



Гародня. Актывісты бяруць на суд ежу ў чаканні арышту. Фота БелСАТ.

Суды пачаліся. **Ежы Грыгенча** заявіу адвод суддзі **Алене Пятровай**, суддзя яго адхіліла.

Суддзя **Наталля Козел** разглядае справы ў адносінах да Сяргея Верамеенкі па ч. 3 арт. 23.34, Аляксандра Абуховіча па ч. 3 арт. 23.34, Антона Вайцехава па ч. 1 арт. 23.34.

Сведкам на ўсіх судовых працэсах праходзіць старэйшы лейтэнант **Аляксей Вайцешка**.

Сябра АГП **Мікалай Салянік** заявіў адвод суддзі **Руслану Гурыну**, але адвод судом не быў задаволены.

Падсудны цытуе Канстытуцыю, артыкулы, якія гарантуюць правы грамадзян на мірныя сходы і мітынгі:

> *«Што я парушыў з гэтай Канстытуцыі? Я вінаваты, што выбіраў гэтага чалавека на прэзыдэнта і прашу прабачэньня ва ўсіх, хто тут прысутнічае. Мне крыўдна за краіну. Я ганаруся, што быў на гэтым мітынгу, хоць і трапіў туды выпадкова», - запытваецца пенсіянер.*

Віталь Гуляк паведамляе на сваёй старонцы ў фэйсбуку:

> Перапынак да 12. У зале прысутнічае нейкі "прадстаўнік", суддзя фармальна задае пытанні. Але відаць, што ці КДБшнік або ад іх. Вангую: мяне, Іру Давідовіч і адсутнага хлопца (у адным з намі зале) - штрафы, астатнім - суткі будуць.
>
> Vital Huliak

Суддзя **Дзмітрый Бубенчык** на сёння "адстраляўся": асудзіў Віталя Гуляка да штрафу ў **30 базавых велічынь**, Ірыну Давідовіч - **да 15 базавых велічынь**. В. Гузевіч у суд сёння не з'явіўся, яго ніхто не ведае.

Суддзя **Руслан Гурын** аштрафаваў Галіну Ламашэвіч на **7 базавых велічынь**, Мікалая Саляніка - на **8 базавых велічынь**, Вольгу Верамеенку - на **15 базавых велічынь**, а Вадзіма Саранчукова асудзіў **да 13 сутак адміністрацыйнага арышту**.



Вадзім Саранчукоў у судзе

У залі прысутнічала каля 25 чалавек, якія гучна скандавалі: *"Ганьба суддзю Гурыну!"*

У судзе абедзенны перапынак, аднак Вадзім Саранчукоў хоча падаць заяву аб выдачы яму матывіровачнай часткі пастановы, а міліцыянты хочуць забраць яго ўжо ў ізалятар.
Ідзе спрэчка паміж імі.



Такім чынам асуджанаму перашкаджаюць падаць заяву, але прысутныя людзі не даюць забраць Саранчукова пакуль ён яе не падасць.

Суддзя **Алена Пятрова** абвесціла рашэнні па трох чалавеках у 14.10: Ежы Грыгенчу асудзіла да адміністрацыйнага арышту **да 13 сутак**, Яўгена Браўна - да штрафу **ў 15 базавых велічынь**, Анатоля Мышкевіча - **да 25 базавых велічынь**.

Суддзя **Наталля Козел** асудзіла Сяргея Верамеенку **да 15 сутак арышту**, Антона Вайцехава **да 15 базавых велічынь штрафу**, Аляксандра Абуховіча **да 20 базавых велічынь штрафу**.





Сяргей Верамеенка з жонкай у судзе

Праваабарончы цэнтр “Вясна” выступіў з заявай, у якой заклікае ўлады спыніць пераслед грамадзян краіны за рэалізацыю імі права на мірны пратэст і выказванне свайго меркавання


Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"




ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY